**Марцынкевіч, Р.** Сны і ява Мішы Лапо / Р. Марцынкевіч // Шлях перамогі (Глыбокае). — 1987. — 1 снеж.

## СНЫ І ЯВА МІШЫ ЛАПО

Прывабіў напеўны скрып «жураўля», які схіліў сваю доўгую «дзюбу» над студняй. Міша падыходзіць бліжэй, дастае поўнае вядро вады, прагна п'е. Вада, такая чыстая і халодная, прыемна студзіць у роце. Здаецца, піў бы і піў, не адрываючыся. Наталіўшы смагу, хлопец астуджвае твар крынічнай вадой, кладзецца ў мяккую шаўкавістую траву, падстаўляе сонцу і без таго залаты чуб, прыкрывае вочы і – пад ласкай сонечных промняў пераносіцца ў свет фантазіі, дзе пануюць цішыня і спакой. Мінуты асалоды парушае гучны плёск адарванага вядра.

Міхаіл прасынаецца. Нясцерпна хочацца піць. У роце перасохла. У палатцы духата такая, што нават уявіць цяжка, як можна было тут заснуць. Няма той жыватворнай вады, ласкавай травы. Над галавой – шацёр, палаткі, якую ахутала цёмная афганская ноч. Як часта бачыліся Міхаілу ў сне там, на афганскай зямлі, дарагія беларускія куточкі. Гэта была не слабасць. Гэта быў сум па сваёй маленькай радзіме: гарадскім пасёлку Падсвілле, дзе нарадзіўся, вырас, закончыў школу, дзе засталіся родныя і блізкія.

Мне, бадай, запярэчаць: маўляў, не толькі сум вяртаў хлопца ў сне дадому. Згодна. Але ці ёсць увогуле такі салдат, які б не лічыў дні, што заставаліся да Загаду аб звальненні ў запас: і тыя, што неслі службу ў нас, у Саюзе, і тыя, каму выпалі больш сур'ёзныя выпрабаванні? Міхаіл Лапо, слесар Пліскага льнозавода, адносіцца да тых, каму выпала…

Ён бачыў абяссіленых ад голаду афганскіх дзяцей, трупы мірных жыхароў, глытаў салёны пот, нюхаў порах, пад свіст шалёных душманскіх куль што ёсць сілы прыціскаўся да голых скал. Гэта была вайна, хоць і неаб'яўленая. Смерць хадзіла побач. Міша, не надта ахвочы да размоў, не любіць расказваць, успамінаць аб сваёй армейскай службе. Лічыць: не кожны можна ўсё ўсвядоміць, зразумець. Гэтая тэма блізкая, бадай, толькі таму, хто сам пабываў там.

Армія яго навучыла многаму: разбірацца ў людзях, сябраваць, надала больш упэўненасці ў сабе, загартавала фізічна.

– Ведаеце, у тых умовах усё дрэннае з цябе выветрываецца. Застаецца толькі добрае. – гаворыць былы воін-інтэрнацыяліст. – Людзі старэйшага пакалення часта папракаюць нас, маладых, маўляў, адно ў галаве: модныя «шмоткі» ды дзікія танцы. У некаторай ступені яны правы. Ёсць такія, для каго замежны «маг» – самамэта. Гэта ўжо жыццёвая пазіцыя. І гэта страшна. Там жа, за мяжой спадае ўсякая напышлівасць і штучнасць. Кожны становіцца сам сабой – і тады разумееш: душы ў нашай моладзі здаровыя.

Міша, калі ўжо размова зайшла аб пазіцыі нашых маладых людзей, як лічыш, чаго ім нестае? – пытаюся ў хлопца.

– Даверу з боку старэйшых, – падумаўшы, кажа Міхаіл. – Мне здаецца, нас празмерна апякаюць. А, як вядома, апека нараджае пасіўнасць: за нас усё рашаюць, а нам застаецца толькі спажываць гатовае. Не трэба спасылацца на нашу маладосць. Хіба мы не даказалі сваю сталасць там…

Там… маецца на ўвазе ў Афганістане. Міша вярнуўся адтуль з медалём «За баявыя заслугі». Асабліва радаваўся Ігар, малодшы брат, які ад Міхаіла – ні на крок. Ён і працаваць

пайшоў на льнозавод, каб быць разам з братам, вучыцца ў яго ўсяму. Не ў інстытут, не ў тэхнікум, а на завод, у сушыльшчыкі. А мог бы паступіць: атэстат аб сярэдняй адукацыі без троек.

Толькі ён рашыў, як старэйшы брат: паступаць пасля арміі. Гэта ў перспектыве. А пакуль, рыхтуе сябе да нялёгкай салдацкай службы. Побач добры настаўнік – старэйшы брат, які дае жыццёвыя ўрокі не толькі яму, Ігару, але і многім мясцовым хлапчукам. Ігар проста зайздросціць брату, калі той апранае парадны касцюм, пінжак якога ўпрыгожвае баявы медаль, і ідзе на сустрэчу ў школу.

Ад такіх сустрэч Міхаіл не адмаўляецца ніколі, хоць і не мастак прыгожа гаварыць.

– Мы проста абавязаны дапамагаць школе выхоўваць у будучых салдат інтэрнацыянальныя пачуцці, – упэўнен у карысці таго, што робіць, былы воін. – Калі не мы, то хто будзе займацца гэтай патрэбнай справай?

Калі не я, то хто ж? Гэтым прынцыпам ён кіраваўся ў школе, калі трэба было выступіць за гонар класа па валейболу, дапамагчы старым, не забываў яго і там, калі грамілі засады афганскіх душманаў.

– Ён і цяпер такі ж, у рабоце, – расказвае майстар змены Тарэза Антонаўна Бурэнь. – Безадмоўны, рупны. Адным словам – хлапец харошы.

…Хутка ідзе час. Падзеі змяняюць адна другую, паціху забываюцца. Толькі ёсць у жыцці маладога хлопца дні, якія бадай, ніколі не сатруцца ў памяці. Мо таму, рэдка сняцца яму цяпер куточкі дарагой Беларусі, а часцей голыя скалы пад нясцерпным афганскім сонцам, а яшчэ… мора. У яго бяскрайней роўнай гладзі купаюць свае крылы чайкі, лёгкая хваля набягае на прыбярэжны пясок, адкатваецца назад. І так зноў і зноў. Як тыя хвалі, набягаюць у сне новыя малюнкі. Міша бачыць сябе ўжо на караблі, далёка ад берага. Як некалі снілася яму роднае Падсвілле, бо марыў аб хутчэйшай сустрэчы з ім, так цяпер сніцца мора – мара яго дзяцінства.

**Р. МАРЦЫНКЕВІЧ,**
г. п. Падсвілле

.